**Вучэбная дысцыпліна «Псіхалогія літаратурнай творчасці»**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05-0232-01 Беларуская філалогія<br>Цыкл спецыяльных дысцыплін: дзяржаўны кампанент<br>Модуль «Стылістычнае і літаратурнае рэдагаванне» |
| **Кароткі змест** | Тэарэтычныя аспекты даследавання літаратурнай творчасці ў псіхалогіі. Псіхалагічныя асаблівасці творчай асобы. Праблема адоранасці і таленту ў працэсе развіцця творчых здольнасцей. Паняцце пра творчы працэс і яго складнікі. Уяўленне і фантазія ў літаратуры. Крэатыўнасць і літаратурная творчасць Метады навучання літаратурнай творчасці. Літаратуразнаўства і псіхалогія Псіхалагічная парадыгма беларускай літаратуры Псіхалагічны партрэт пісьменніка. |
| **Фарміруемыя кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку вывучэння курса студэнты павінны ***ведаць:*** псіхалагічныя перадумовы фарміравання творчых здольнасцей, таленту; розныя віды складнікаў у літаратурнай дзейнасці; умовы і фактары фарміравання творчых здольнасцей; прыёмы і спосабы развіцця творчых здольнасцей дзяцей; ***умець*:** аналізаваць літаратурны твор з улікам усіх фактараў псіхалагічнага плану; бачыць дамінанту і ўсе элементы мастацкага стылю пісьменніка, разумець іх сувязь з творчай індывідуальнасцю пісьменніка; вызначаць пры дапамозе пэўных прыёмаў і тэстаў творчыя здольнасці чалавека.<br>Вывучэнне дысцыпліны павінна збяспечыць фарміраванне ў спецыяліста **кампетэнцыі** СК-2. Разумець псіхалагічныя механізмы літаратурна-мастацкай дзейнасці, заканамернасці псіхалагічнай арганізацыі мастацкага твора і выяўлення ў тэксце асобы аўтара. |
| **Прэрэквізіты** | Гісторыя беларускай літаратуры XI–XVII. Гісторыя беларускай літаратуры XVIII–перш. пал. XIX стст. Гісторыя беларускай літаратуры др. пал. XIX стст. Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. Гісторыя беларускай літаратуры канца XX–пач. XXI ст. Гісторыя рускай літаратуры. Гісторыя замежнай літаратуры. Тэорыя літаратуры. |
| **Працаёмкасць** | 2 заліковыя адзінкі, 90 акадэмічных гадзін, з іх 34 аўдыторных: 20 гадз. лекцый і 14 гадз. практычных заняткаў. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 5 семестр, калоквіум, тэст, экзамен |